■ Парадак на зямлі

ДОБРАЯ СПРАВА АБ'ЯДНОЎВАЕ

Падчас рэспубліканскага суботніка больш за 2,6 тысячы работнікаў сістэмы Мінпрыроды прынялі ўдзел у экалагічнай кампаніі «Уладкуем малую радзіму»

Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Калектыў цэнтральнага апарату Мінпрыроды добраўпарадкаваў пляцоўкі на дзяржаўным прадпрыемстве «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі» ў Мінску, каля будынка міністэрства па вуліцы Калектарнай, у скверы імя К. Цэткін. Яны прывялі да ладу тэрыторыю, высадзілі туі, арганізавалі клумбы, падрэзалі хмызнякі. Удзельнікамі кампаніі сталі таксама і супрацоўнікі ўсіх тэрытарыяльных органаў і падначаленых арганізацый прыродаахоўнага ведамства — усяго добраўпарадкаваннем тэрыторыі падчас суботніка займаліся больш за 2,6 тысячы работнікаў сістэмы Мінпрыроды.

— Пытанням навядзення парадку на зямлі ў Беларусі ўдзяляецца сур'ёзная ўвага на самым высокім узроўні, — адзначыў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык. — Абвяшчэнне 2018-га Годам малой радзімы вельмі важна і актуальна, бо неабходна забяспечыць парадак ва ўсіх кутках Беларусі — на дарогах, у палях, лугах, лясах, у вялікіх і малых населеных пунктах. Акцыя «Уладкуем малую радзіму», аб'яўленая Мінпрыроды, з'яўляецца адным з мерапрыемстваў рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі. Яе мэта — аб'яднаць у гэтай добрай справе як мага больш жыхароў Беларусі. Хацелася б, каб кожны зрабіў свой унёсак у добраўпарадкаванне населеных пунктаў.

Вераніка КОЛАСАВА

Глабальная экалагічная кампанія «Уладкуем малую радзіму», абвешчаная Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, прымеркавана да Года малой радзімы і праходзіць у перыяд з красавіка да кастрычніка 2018 года.

■ Супрацоўніцтва

ТАРФЯНІКІ РЭАБІЛІТУЮЦЬ

Мінпрыроды сумесна з Канвенцыяй ААН па барацьбе з апустыньваннем правядзе мерапрыемствы па выратаванні дэградаваных тэрыторый

Праект «Аднаўленне асушаных тарфянікаў у Беларусі» Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя прэзентавала ў ААН. Прапанова была ўхвалена Сакратарыятам Канвенцыі ААН па барацьбе з апустыньваннем у тых краінах, якія адчуваюць сур'ёзную засуху і/або апустыньванне, асабліва ў Афрыцы.

Як расказалі ў Мінпрыроды, беларускі праект стаў часткай мерапрыемстваў Чангвонскай ініцыятывы «Партнёрства па азеляненні засушлівых зямель», якая фінансуецца са сродкаў Міністэрства харчавання, сельскай гаспадаркі, лясной гаспадаркі і рыбалоўства Паўднёвай Карэі. У межах гэтай міжнароднай ініцыятывы Беларусь была адабрана сярод краін рэгіёна Усходняй Еўропы і Сярэдняй Азіі для ажыццяўлення дэманстрацыйнага праекта па экалагічнай рэабілітацыі дэградаваных тэрыторый і ўкараненні падыходу па нейтральнай дэградацыі зямель на мясцовым узроўні.

Сродкі, выдзеленыя на рэалізацыю пілотнага праекта, дазволяць аднавіць парушаныя тарфянікі ў Магілёўскай вобласці. У прыватнасці, будзе здзейснена экалагічная рэабілітацыя (праз пасадку лесу альбо забалочванне) не менш за 1000 га асушаных тарфянікаў для ўключэння іх у гаспадарчы абарот. Адбор канкрэтных тэрыторый для вядзення работ адбудзецца ў маі-чэрвені 2018 года, а само аднаўленне — на працягу 2018—2019 гадоў. Таксама са сродкаў праекта прафінансуюць мерапрыемствы, накіраваныя на прапаганду рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і прадухіленне дэградацыі зямель у будучым.

Рэалізацыя гэтага праекта будзе спрыяць выкананню задач сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці.

Маргарыта ДРАЗДОВА

Прырода малой радзімы

Ад кожнага залежыць, наколькі дабрадзейнай яна будзе для нас

Часопіс «Родная прырода» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з Міністэрствам адукацыі распачынае новы праект — рэспубліканскі конкурс ідэй «Прырода малой радзімы».

Мы запрашаем да ўдзелу дарослых і дзяцей, вучняў і іх настаўнікаў — усіх, хто любіць беларускую прыроду і хоча змяніць да лепшага экалагічную сітуацыю на сваёй малой радзіме і ў краіне ў цэлым.

Дасылайце на адрас pryroda@zviazda.by свае ідэі і праекты, накіраваныя на захаванне і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, вывучэнне экалагічных праблем населеных пунктаў і пошук шляхоў іх рашэння. Самыя цікавыя будуць апублікаваныя на старонках часопіса «Родная прырода», а іх аўтары атрымаюць падарункі. Прыём конкурсных работ — з 1 мая да 15 кастрычніка. Падвядзенне вынікаў конкурсу і вызначэнне пераможцаў у намінацыях пройдзе з 16 кастрычніка па 15 лістапада, вынікі конкурсу і конкурсныя работы пераможцаў будуць апублікаваны ў снежні 2018 года.

Дадатковую інфармацыю і Палажэнне аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу ідэй «Прырода малой радзімы» можна прачытаць на старонцы часопіса «Родная прырода» http://zviazda.by/be/edition/rodnaya-pryroda, а таксама на сайце Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя minpriroda.gov.by

Давайце разам зробім Беларусь яшчэ больш прыгожай і зялёнай!

■ Рэпартаж

Як у сталіцы выяўляюць пункты нелегальнага продажу чырванакніжнікаў

«Учора бабуля паспела збегчы, а я — не»

Чарамша, ці мядзведжая цыбуля, — расліна чырванакніжная, і гандляваць ёй катэгарычна забаронена. Аднак кожны год знаходзяцца людзі, якія гэтага не ведаюць ці толькі робяць такі выгляд. Разам са спецыялістамі Мінпрыроды мы адправіліся ў рэйд, каб нагадаць нелегальным гандлярам, колькі сапраўды каштуе пучок чарамшы.

Намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды Таццяна ЕЎДАСЁВА заклікае гандляроў не прадаваць чарамшу.

Мінпрыроды папярэджвае, што ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце» забараняюцца самавольныя канфіскацыі і перасадкі дзікарослых раслін, якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу, з асяроддзя іх росту, іх незаконны абарот, а таксама выдаленне і ўчыненне іншых дзеянняў, якія могуць прывесці да іх гібелі, скарачэння колькасці або парушэння асяроддзя іх росту.

За парушэнне гэтых патрабаванняў вінаватыя асобы прыцягваюцца да адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 15.8 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і караюцца штрафнымі санкцыямі ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь.

На выхадзе з метро «Каменная Горка» нелегальны гандаль «цвіце» круглы год, а ўвесну асартымент папаўняецца яшчэ і рэдкімі раслінамі. Чарамша знаходзіцца ў Чырвонай кнізе з 1962 года, але масавы збор яе не спыняецца. І паступова расліна знікае ў некаторых рэгіёнах. Кожны год Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя спрабуе данесці да людзей, чаму рваць мядзведжую цыбулю нельга і якую альтэрнатыву можна знайсці (напрыклад, вырасціць самому). Аднак пакуль сітуацыя не моцна мяняецца.

— Рэйды мы праводзім каля трох гадоў, але практыка паказвае, што людзі гандлявалі, гандлююць і, мусіць, будуць працягваць гандляваць. Прычым адны і тыя ж, — адзначыў **начальнік аддзела аператыўнага кантролю па Партызанскім, Першамайскім, Фрунзенскім раёнах г. Мінска Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Дзмітрый АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — Летась толькі ў аднаго чалавека былі неабходныя дакументы для продажу, астатнія гандлююць нелегальна. Штрафы, вядома, прадугледжаны вялікія, але выпісаць іх могуць тады, калі зловяць у лесе «за руку». А гандляроў, на жаль, можа штрафаваць толькі мясцовая адміністрацыя і толькі за незаконны гандаль.

Па даных Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, летась было складзена 36 пратаколаў па артыкуле 15.8 за незаконную канфіскацыю чырванакніжных раслін, пераважна чарамшы.

У гэты момант да нас падыходзяць прадстаўнікі адміністрацыі Фрунзенскага раёна і міліцыі. Наперад адпраўляюцца тыя, каго гандляры яшчэ не ведаюць. Аднак як толькі з-за машын з'яўляюцца людзі ў форме, стыхійны рынак імгненна знікае.

Жанчыну, якая прадае чарамшу ў пераходзе, затрымліваюць. На скрынках у яе яшчэ ляжаць цыбуля і радыска.

— Я радыску прадаю. Што, радыску нельга? Куды мне збірацца, я ж толькі ўчора там была, — хутка гаворыць жанчына, пакуль нейкі мужчына забірае ў яе скрынкі і адносіць у машыну.

Гандлярку накіроўваюць у мікрааўтобус, каб адвезці ў адміністрацыю раёна для ўстанаўлення асобы і складання пратакола.

— Вы ведаеце, што чарамша знаходзіцца на мяжы знікнення і прадаваць яе нельга? — пытаюцца прадстаўнікі Мінпрыроды.

— Такіх, як я, мільён, — адказвае жанчына. — Мне трэба дзяцей карміць! І што мне рабіць? Даяркай за 150 рублёў працаваць? Адсюль нікуды не пайду, але чарамшу прадаваць не буду.

Пазней высвятляецца, што на Вольгу (так прадставілася жанчына) учора ўжо быў складзены пратакол, але штраф яна не пагадзілася аплачваць на месцы. Таму, хутчэй за ўсё, прыйдзецца вырашаць справу праз суд.

— Вось учора бабуля паспела збегчы, а я — не. Ну давайце, вязіце мяне ўжо, — гаворыць напаследак Вольга.

Праз некалькі хвілін нас завуць спусціцца ў пераход, дзе прыкмечаны яшчэ адзін нелегал. Дзяўчына стаіць з накрытымі скрынкамі і сцвярджае, што ўсё сваё, дамашняе.

— Пакажыце, калі ласка, дакументы ад сельсавета, — просіць **намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды Таццяна ЕЎДАСЁВА.** —

Так выглядае чырванакніжная чарамша, гандляваць якой нельга.

Вы ж ведаеце, што чарамша занесена ў Чырвоную кнігу?

— Чарамша са свайго агарода, а дакументы нам выдаюць пасля таго, як бульба вырасце, — зусім непраўдападобна хлусіць дзяўчына.

— А куды ваш напарнік збег, вы ж не адна стаялі? — пытаюцца прадстаўнікі міліцыі.

— Які напарнік? Я адна! Вы бачыце, што я нешта прадаю? Я проста стаю, яшчэ нават не распакоўвалася, — ужо злосна адказвае гандлярка.

— Пра тое, што тут сіндыкат, мы казаць не можам. Яны гавораць, што ці алкаголікі прынеслі, ці знайшлі дзе-небудзь, ці самі вырасцілі, — адзначыў Дзмітрый Александровіч. — Прадаюць чарамшу, у асноўным, пенсіянеры, а ваяваць з імі сэнсу няма. Таму мы і заклікаем людзей не купляць чырванакніжнікі ў пераходах.

Кацярына ЦІТОВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ

■ Біяразнастайнасць

ДЗЕНЬ ДАЎЖЫНЁЙ У ГОД

Толькі агульнымі высілкамі спецыялістаў і кожнага жыхара можна зберагчы родную прыроду

Напярэдадні Міжнароднага дня Маці-Зямлі (адзначаецца 22 красавіка) эксперты расказалі, як захаваць і ўстойліва выкарыстоўваць біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, і што робіцца ў нашай краіне для гэтага.

Акрамя зацвярджэння Схемы нацыянальнай экалагічнай сеткі, мэта якой — захаваць каштоўныя прыродныя тэрыторыі ў натуральным стане, сёлета адбыліся змены і ў некаторых асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях. Як расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Андрэй КУЗЬМІЧ,** сёлета пераўтвораны рэспубліканскія заказнікі «Прыбужскае Палессе», плошча якога павялічылася на 9280 га, і «Сэрвач». Падрыхтаваныя пакеты дакументаў па пераўтварэнні заказнікаў «Чырвоны Бор» і «Буслоўка».

Сёння Мінпрыроды таксама прымае ўдзел у рабоце над законапраектамі, падрыхтоўка якіх была ініцыяваная дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Адзін з іх — новая рэдакцыя Закона «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях», у якой прадугледжана кансалідацыя абмежаванняў і забарон, што ўсталёўваюцца на ААПТ розных катэгорый, а таксама перанос на ўзровень закона прававых нормаў падзаконных актаў, шматгадовая практыка прымянення якіх дазваляе гэта зрабіць.

— Такім чынам, гэты закон павінен наблізіцца да паняцця «закона прамога дзеяння», з мінімальнай колькасцю адсылачных нормаў, — падкрэсліў Андрэй Кузьміч.

Дырэктар ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ адзначыў, што АПБ імкнецца да таго, каб усе віды птушак былі пад аховай, сёння такіх толькі 75 %. Вострая тэма — паляванне на крылатых. Справа ў тым, што ў экзамене на білет паляўнічага няма ніводнага пытання пра птушак. Паляўнічыя не ведаюць іх і часта знішчаюць прадстаўнікоў рэдкіх відаў. Аляксандр Вінчэўскі прапануе пераняць вопыт Нідэрландаў: там дазволена паляваць толькі на крыжанку, курапатку і фазана.

Яшчэ адзін законапраект, падрыхтоўка якога ідзе ў краіне, прадугледжвае ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб раслінным свеце» з улікам напрацаванай практыкі прымянення нормаў, уключаных у гэты закон у 2016 годзе. Згаданы дакумент будзе закранаць пытанні парадку выдалення аб'ектаў расліннага свету, кампенсацыйных пасадак і кампенсацыйных выплат кошту выдаленых аб'ектаў расліннага свету, рэгулявання адносін, звязаных з азеляненнем тэрыторый у населеных пунктах. Акрамя таго, пачата работа па арганізацыі падрыхтоўкі праекта Закона «Аб ахове і выкарыстанні балот (тарфянікаў)».

Андрэй Кузьміч таксама заклікаў усіх грамадзян нашай краіны ў Год малой радзімы звярнуць увагу на прыроду родных мясцін, унесці свой пасільны ўклад і дапамагчы ёй стаць больш чыстай, бо толькі ўсе разам мы зможам зрабіць Беларусь яшчэ лепшай.

Аксана ЯНОЎСКАЯ

■ Ахова прыроды

Юрый ГРЫНКЕВІЧ:

«МЫ НЕ АПОШНІЯ НА ГЭТАЙ ЗЯМЛІ»

У Нясвіжы за экалогію змагаюцца рублём і выхоўваюць ужо другое пакаленне сяброў прыроды

У старым парку Радзівілаў шпакі даюць канцэрт. Тут ім утульна жывецца. «Домікі для птушак дзеці майструюць кожны год. Яны з задавальненнем удзельнічаюць у конкурсе на найлепшую шпакоўню «Сустракаем птушыных сяброў». Бачыце — кожная з іх непаўторная, ёсць нават у выглядзе жолуда», — расказвае начальнік Нясвіжскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Юрый ГРЫНКЕВІЧ.

— Работа з дзецьмі — адзін з нашых прыярытэтаў. Сёння можна з упэўненасцю казаць, што ў раёне створана сістэма па экалагічным выхаванні, — працягвае размову Юрый Іванавіч. — Першага чэрвеня ўжо у 16-ы раз мы правядзём раённы экалагічны форум. Гэта не разавае мерапрыемства, а падвядзенне вынікаў працы за год. Дзеці, якія прымалі актыўны ўдзел у самых розных экалагічных праектах, атрымаюць падзякі і падарункі. Зразумела, што гэта наша сумесная праца з раённым аддзелам адукацыі і пры падтрымцы райвыканкама. Мы выхоўваем ужо другое пакаленне людзей з экалагічна дружалюбнымі паводзінамі. Навучэнцы, якія атрымалі падарункі на нашым першым форуме, ужо самі бацькі, і цяпер іх дзеці атрымліваюць узнагароды, а сярод нашых юных актывістаў ёсць нават выхаванцы дзіцячых садкоў.

— Нясвіж заўсёды быў прыгожым, утульным горадам. Пэўна, менталітэт у нясвіжцаў такі — чыста там, дзе не смецяць...

— Так, людзі любяць свой горад і не шкадуюць сіл на яго добраўпарадкаванне. Правялі раённы суботнік, папрацавалі і на рэспубліканскім. Але скажу так: чыста яшчэ і там, дзе створаны для гэтага ўмовы. Пакуль што толькі для цэнтральных, так бы мовіць, турыстычных вуліц закупілі сучасныя кантэйнеры для смецця. Таксама жыхары гэтых вуліц атрымалі па тры спецыяльныя пакеты, у якія яны складваюць макулатуру, пластык і шкло. Калі пакеты запоўнены, людзі тэлефануюць і замаўляюць машыну. Вядзецца ўлік, і ў выніку чалавек атрымлівае зніжку па аплаце камунальных паслуг у памеры кошту здадзеных ім другасных матэрыяльных рэсурсаў. У кожнай вёсцы раёна таксама наладжаны раздзельны збор і планавы вываз смецця. А за здачу другасных матэрыяльных рэсурсаў вясковыя жыхары атрымліваюць кампенсацыю: сыравіну збіраюць кіроўцы, у якіх ёсць вагі, наяўныя грошы. Я лічу, што гэта добрая практыка.

— Пачынаецца дачны сезон. Юрый Іванавіч, ці шмат праблем ствараюць дачнікі? Некаторыя з іх выкідаюць у тым ліку буйнагабарытнае смецце і ў полі, і ў лесе...

— Дачных таварыстваў у нас усяго 12, з іх перарэгістраваны восем. Таварыствы невялікія, з імі асаблівых праблем няма. Іншая справа, што ў вёсках шмат дамоў гараджане атрымалі ў спадчыну ці набылі пад лецішчы. Вось тут мы павінны дайсці да кожнага і пераканаць заключыць дамову на вываз смецця на дачны сезон. Калі чалавек плаціць, то і карыстаецца паслугай. Са сметнікамі ў лесе змагаемся разам з лясніцтвам. Дамовіліся так: калі я ўбачу сметнік у лесе — штрафуем леснікоў; калі яны знайшлі, хто выкінуў смецце, запрашаем чалавека ў інспекцыю, тлумачым, што ён парушыў, і прапануем два варыянты: максімальны штраф для фізічных асоб — 20 базавых велічынь або мінімальны (1 БВ) і ачыстка дзялянкі лесу. Пагалоска пра гэтыя меры хутка пайшла па раёне, і колькасць сметнікаў у лясах зменшылася. Шчыра кажучы, выпісаць штраф — невялікая навука, а вось стварыць умовы, каб быў належны парадак, складаней.

Фота Аксаны ГРОХ.

— Вы ўжо 20 гадоў працуеце ў інспекцыі. Якія змены ў адносінах людзей да прыроды заўважылі?

— На самым пачатку даводзілася сутыкацца і з тым, што, напрыклад, старшыня калгаса рабіў нешта пад прымусам — маўляў, экалогія патрабуе. Цяпер іншы падыход, з'явілася разуменне, што мы не апошнія на гэтай зямлі, за намі — дзеці ды ўнукі. У раёне шмат зроблена і робіцца, каб не шкодзіць навакольнаму асяроддзю. Зразумела, добра, што раён паспяховы, прадпрыемствы маюць сродкі і жаданне набываць сучаснае абсталяванне. Так, напрыклад, пабудаваны завод дзіцячага харчавання. Там аўтаматычная сістэма кантролю ачышчальных збудаванняў, і ў выпадку нейкага збою проста спыніцца работа. На буйных прадпрыемствах — АК «Сноў», ТАА «Лань-Нясвіж» — устаноўлены біягазавыя комплексы, дзякуючы якім жывёлагадоўчыя адходы ператвараюцца ў электра- і цеплаэнергію, ды і з фінансавага боку гэта выгадна.

Але ёсць і праблемныя пытанні. У нас добрая пітная вада, дзейнічаюць станцыі абезжалезвання, але як толькі вада трапляе ў старыя трубы, найбольш такіх у сельскай мясцовасці, яе якасць пагаршаецца. Цяпер разам з навукоўцамі займаемся вадаёмамі, каб яны не зацвіталі ў летні перыяд. Гэта даволі складаныя пытанні, якія патрабуюць і вялікіх матэрыяльных выдаткаў. Але я ўпэўнены, што яны будуць вырашаны, бо наша інспекцыя, усе раённыя ўлады і жыхары шмат робяць для таго, каб наш край быў прыгожы, бяспечны і зялёны.

Аксана ЯНОЎСКАЯ